№№179–180
(2907–2908)

27 лістапада 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ПАРАЎНАЕМ

Бензін таннее. Толькі не ў Беларусі

Беларусам не выпадае чакаць зніжэння коштаў на паліва

Нягледзячы на тое, што кошт на нафту ў свеце няўхільна зніжаецца, адпаведна таннее і паліва, беларускія прадпрыемствы і аўтааматары наўрад ці будуць плаціць за яго менш. Наадварот, па інфармацыі крыніц, блізкіх да Міністэрства фінансаў Беларусі, гэтае ведамства хутка выступіць з ініцыятывай павялічыць акцызны падатак на нафтапрадукты ажно на 10%. Робіцца гэта нібыта для павелічэння паступлення ў бюджэт грошай ад продажу нафтапрадуктаў на ўнутраным рынку.

Цікава, што крыху раней урад Беларусі разглядаў магчымасць зніжэння коштаў на бензін, але ў рэшце рэшт такі крок чамусьці быў прызнаны немэтазгодным. Гэта можа сведчыць толькі аб адным — чыноўнікі, якія вельмі любяць расказваць, як яны клапоцяцца аб народзе, за лічбамі не бачаць канкрэтных людзей. Яны ў першую чаргу думаюць аб папаўненні бюджэту, з якога атрымоўваюць заработныя платы, а не пра тое, як рэальна дапамагчы сэканоміць грошы ў гаманцах беларусаў...

Зараз літр 95-га бензіну ў Беларусі каштуе 2810 рублёў. Сярод краін-суседак толькі ў Польшчы пакуль літр бензіну каштуе даражэй. Аднак і там паліва таннее штотыдзень.

Таксама паліва таннее і ў Расіі. Так, на мінулым тыдні літр 95-га бензіну на расійскіх запраўках стаў дзешавейшым на 78 беларускіх рублёў. У пераліку на беларускую валюту літр бензіну ў Расіі каштуе 1750 беларускіх рублёў. У сваю чаргу прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка дала даручэнне ўраду знізіць кошт літра таго ж бензіну да адзнакі ў 1850 рублёў (калі пералічыць на беларускія). Хоць крыху, але танней, чым у нас, літр бензіну каштуе і ў заможнай у параўнанні з Беларуссю Літве — 2600 рублёў.

Высокі кошт на бензін у нашай краіне можна было б апраўдаць тым, што заробкі беларусаў значна вышэйшыя, чым у суседзяў. Але параўнаем: па дадзеных Міністэрства статыстыкі Беларусі, налічаны сярэднемесячны заробак у Беларусі за 10 месяцаў гэтага года склаў 867 тысяч рублёў. Гэта прыкладна 400 долараў ЗША. У сваю чаргу сярэдняя зарплата ўкраінца на сённяшні дзень складае 1515 грывен (гэта прыкладна 300 долараў ЗША). Сярэдні заробак расіяніна — 17.847 рублёў (прыкладна 645 долараў), а ў Літве сярэдні заробак пасля выліку падаткаў — 640 долараў. Такім чынам, беларус, які атрымлівае сярэдні заробак, можа набыць 308 літраў бензіну, літовец — 528 літраў, украінец — 348 літраў, а расіянін — 788 літраў. Вось так пра нас клапоціцца наш урад!

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Краіна	Кошт 1 літра бензіна (бел. рублі)	Сярэдні заробак (долары ЗША)	Колькасць літраў
Беларусь	2810	400	308
Украіна	1850	300	348
Расія	1750	645	788
Літва	2600	640	528

КАДРЫ

Вылечит ли Косинец Витебскую область?

Среди белорусских губернаторов появился первый доктор наук. Вице-премьер по социальным вопросам Александр Косинец назначен председателем Витебского облисполкома.

Косинец Александр Николаевич родился в 1959 году в д.Русский Селец Оршанского района Витебской области.

В 1982 году окончил Витебский государственный медицинский институт, в 2007-м — магистратуру экономического факультета Белорусского государственного университета. Доктор медицинских наук, профессор. Заслуженный деятель науки Беларуси, награжден медалью "За трудовую доблесть".

С 1980-го по 1994 год работал в Витебском государственном медицинском институте: клиническим ординатором, ассистентом, доцентом кафедры госпитальной хирургии. В 1995—1997 годах возглавлял Республиканский научно-практический центр "Инфекция и хирургия". В 1997—2005 годах — ректор Витебского государственного ордена Дружбы народов медицинского университета.

До 24 ноября 2008 года занимал должность заместителя премьер-министра Беларуси. Последняя акция на посту вице-премьера, которой отметился Александр Косинец — поход по квартирам минских пьяниц, у которых государство вынуждено было забрать детей.

Кстати, Александр Косинец, похоже, основательно готовился к нынешней должности. В 2007 году в БГУ доктор медицинских наук, профессор и вице-премьер защитил магистерскую диссертацию по экономике.

Елена НОВИКОВА.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Серп и голод

В недавние дни, когда Украина стонала от незаживающей раны Голодомора, некая московская дама из новомодной породы так называемых "независимых политологов" так высказалась в телеэфире об этой трагедии: "...Голодомор? Исторический термин".

Почему-то она напомнила мне одно минское застолье где-то в конце 70-х годов прошлого века. Под аплодисменты подали бутерброды с икрой, раздобытой хозяйкой по близкому знакомству с одним из распорядителей дефицита. "А вы помните, — спросил сосед по столу, вытирая рот салфеткой, — как в пятидесятых годах в Минске продавали икру прямо из бочек?"

Конечно, я помнил. Я даже помнил, где продавали — в гастрономе напротив Дома правительства, занимавшем первый из пяти этажей здания в стиле ампир. И не только икру — консервы "Снатка" из настоящих крабов, копченые колбасы, источавшие головокружительный аромат, и сельдь, тоже из бочек, иногда под странным названием "иваси"...

Еще я помнил тетю Полю из тех же лет. Гремя по утрам бидонами, в галошах на босу ногу, разносила по начальству молоко, реже — телятину, пересчитывая после каждой продажи мятые дореформенные трешки и рубли. Пробовала ли сама?..

Помнил и Матея из нарочанской деревни Купа, куда в годы упомянутого икорно-колбасного благолепия стали наезжать из Минска первые советские дачники. До невероятности худой, до черноты высохший от ветра и солнца, горбатился — у него и вправду уже тогда, в три десятка лет, обозначился нарастающий горб — от зари до зари, раз на дню подкрепляясь затиркой и постной картошкой...

И Тафилю, жену Матея, враз и окончательно оглохшую и онемевшую от его пьяного кулака, запомнил на всю жизнь. Что-то мыча, она однажды позвала меня с собой в поле, вручила острющий серп и стала показывать, как надо жать ржаные колосья и вязать снопы. Через полчаса я выдохся от этой работы и улегся в тени куста на краю поля. Открыл глаза ближе к закату — Тафиля все еще вязала снопы...

И Вероничку помнил, их трехлетнюю дочурку. Сунув за мурзатую щеку конфету — очередное дачное угощение, — заключала с недетской серьезностью: "Добра ў горадзе жывуць — па радыё пяюць і цукеркі ядуць..."

Уже тогда, будучи подростком из благополучной городской семьи, я пытался найти и не находил ответа на вопрос, как могут люди, которые растят и жнут хлеб, сами жить впроголодь. И не жить даже, а, как узналось много позже, неимоверными миллионами умирать...

К ответу, мне кажется, ближе всех подошла сегодня Украина, определив невероятную в любой другой земной местности и даже во всей земной истории трагедию страшным словом "геноцид".

В разных странах и временах, вплоть до нынешних, голод косил и косит целые племена и народы по разным причинам, социальным в том числе, — засухи, наводнения, войны...

Но лишь коммунистический эксперимент сотворил Голодомор сознательно, в виде целенаправленного и беспощадного социально-политического акта, получившего в советских учебниках название "ликвидация кулачества как класса", и продолженного созданием "новой исторической общности", поименованной "советский народ". Под знаком, разумеется, крестьянского серпа и рабочего молота...

Сегодня, когда Украина оплакивает жертвы той "ликвидации" и всеми силами изживает из себя "новую историческую общность", российский истеблишмент выясняет с вовлечением широких масс телезрителей, кто из наиболее кровавых исторических личностей может стать ее Именем...

Какое уж тут признание геноцида?! Или хотя бы признание права Украины считать геноцидом ликвидацию голодом и ГУЛАГом собственного крестьянства...

И такого же права россиян, белорусов, казахов...

Только в этом случае станет понятным и нынешним поколениям, почему трагедия коммунизма была для всех народов СССР общей судьбой.

Но вместо такого признания — бессовестный со стороны Москвы политический вызов, демонстративная безучастность Минска и холодная война терминов вокруг поминовения миллионов невинных жертв.

Всему этому можно, наверное, найти немало причин. Но одна, по-моему, очевидна. Россия, объявив себя по совершенно понятной исторической логике юридической правопреемницей СССР, категорическим образом сторонится моральной ответственности своего предшественника за совершенные в годы его существования преступления. Потому что признание такой ответственности означает не просто осуждение этих преступлений между якобы либеральным новоделом и второпях, а самый что ни на есть Суд, Очищение и Отречение от большевизма.

Но, видно, крепка связь, генетически нерушима, хотя и скрывается до некой отдаленной поры.

Что ж до официального Минска, то безучастность его постыдна.

И впрямь: кому "чарка и шкварка", кому — "каласы пад сярпом...".

kamerton_41@mail.ru

ДАРЭЧЫ

Пра тое, што нягледзячы на зніжэнне сусветных цэн на нафту бензін у Беларусі дзешавець не будзе, міністр эканомікі Мікалай Зайчанка паведаміў яшчэ месяц таму. Ён патлумачыў гэта тым, што "сёння на ўнутраным рынку цэны на бензін з'яўляюцца стратнымі, і баланс падтрымліваецца толькі за кошт экспарту." Аднак эксперты Агенцтва фінансавых навін аспрэчваюць гэтую заяву.

"Сёння каціроўкі аптовых цэн на экспарт і рэалізацыю нафтапрадуктаў на ўнутраным рынку значна адрозніваюцца. Так, каціроўкі бензіну АІ-92 на пастаўку па самой Беларусі — 1168 долараў за тону, а на экспарт — 450 долараў за тону, бензін АІ-95 адпаведна каштуе 1337 долараў для Беларусі і 468,5 на экспарт, дызельнае паліва — 848,8 і 646,5 долараў за тону адпаведна. Здаецца, трэба быць сляпым, каб не бачыць, што коштам на бензін ёсць куды падаць. І не на 5—10 працэнтаў, а ў разы.

ГРОШЫ

Беларусы вывозяць валюту з краіны

У Беларусі вываз наяўнай замежнай валюты ў студзені-верасні 2008 года вырас у параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года ў 2,75 раза і склаў 1 мільярд 112 мільёнаў долараў.

У тым ліку вываз наяўных долараў ЗША ў студзені-верасні 2008 года павялічыўся ў 3 разы — да 926,195 мільёна.

Наяўнымі еўра ў студзені-верасні вывезена на суму 119,844 мільёна долараў у эквіваленце (+64,8 працэнта). Расійскіх рублёў, вывезеных у наяўнай валюце, стала больш у 3,6 раза — да 60,320 мільёна долараў у эквіваленце. На іншыя валюты прыйшлося 5,729 мільёна долараў (рост у 3,58 раза).

ГУЧНАЯ СПРАВА

Суд прызначаны

Працэс над Аляксандрам Баразенкам, якога называюць новым беларускім палітзняволеным, прызначаны на панядзелак, 8 снежня. Працэс будзе праходзіць у судзе Цэнтральнага раёна Мінска.

Пра гэта паведаміў БелаПАН адвакат Баразенкі Павел Сапелка.

Судзіць А.Баразенку будзе Наталля Вайцяховіч.

А.Баразенка з'яўляецца фігурантам "справы чатырнаццаці". За ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў зімой 2008 года іншыя фігуранты гэтай справы — Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Міхаіл Пашкевіч, Павел Вінаградаў, Міхаіл Крываў, Аляксандр Стральцоў, Аляксандр Чарнышоў, Таццяна Цішкевіч і Міхаіл Субач — прыгавораны да абмежавання волі на два гады без накіравання ў папраўчыя ўстановы. Антон Койпіш і Уладзімір Сяргееў аштрафаваны на 100 базавых велічыняў. Непаўналетні Максім Дашук прыгавораны да 1,5 года абмежавання волі, Андрэй Кім — да пазбаўлення волі на 1,5 года з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму на падставе двух артыкулаў: гвалт у дачыненні да супрацоўніка міліцыі і ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. 20 жніўня А.Кім быў вызвалены ў адпаведнасці з указам прэзідэнта аб памілаванні.

А.Баразенка знаходзіцца ў следчым ізалятары №1 па вуліцы Валадарскага ў Мінску. Актывіст аб'явіў галадоўку ў знак пратэсту, аднак адвакат здолеў пераканаць яго спыніць гэтую акцыю.

Сяргей ПУЛЬША.

Самыя багатыя — мінчане

Налічаная сярэдняя зарплата работнікаў у кастрычніку склала 958 тысяч 358 рублёў. Аб гэтым паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт.

Па ўзроўні заробкаў лідзіруе Мінск. У кастрычніку сярэдні заробак у сталіцы склаў 1 мільён 277 тысяч рублёў.

На прамысловых прадпрыемствах сярэдняя заработная плата ў кастрычніку склала 1 мільён 104 тысячы, у будаўнічых арганізацыях — 1 млн 339 тыс., на прадпрыемствах транспарту — 1 млн 138,4 тысячы. А вось у арганізацыях сельскай гаспадаркі сярэдні заробак ледзь дацягнуў да 620,3 тыс., ва ўстановах аховы здароўя — 699,4 тыс., ва ўстановах адукацыі — 623,1 тысячы.

Жыццё пражылі на мінах

Больш за 40 мінамётных мін былі знойдзены пад верандай у адным з дамоў вёскі Вярхоўе Бешанковіцкага раёна.

У хаце, што была пабудавана адразу пасля вайны, жывуць дзве бабулі — зусім старэнькая маці і яе дачка. Днямі яны вырашылі ўмацаваць фундамент веранды, таму што з цягам часу яе перакасіла і дрэнна сталі зачыняцца дзверы. Падчас рамонту і знайшліся міны.

У НУМАР!

«Рэал» прывёз у Мінск асабістага повара

Гэты нумар газеты мы трымалі ў рэдакцыі літаральна да апоўначы. Трымалі, спадзяючыся, што барысаўскі БАТЭ створыць сенсацыю ў матчы Лігі чэмпіёнаў супраць мадрыдскага "Рэала". Але за 10 хвілін да канца сустрэчы, калі смаленскія друкарні не маглі нас болей чакаць, беларусы саступалі з лікам 0:1...

...Білеты на матч Лігі чэмпіёнаў пачалі прадаваць яшчэ за тыдзень да гульні. Ажыятаж быў неверагодны. Людзі, каб купіць білет у дзесяць гадзін раніцы, займалі чаргу яшчэ з вечара і стаялі на вуліцы ўсю ноч.

— Я заняў чаргу ў дванаццаць вечара, — распавёў мне балельшчык, які прыехаў з Барысава. — Ноччу нават ледзь бойка не адбылася. Бо мы запісвалі нумары на руках, а некаторыя стараліся прарвацца без чаргі. Давялося самім выклікаць міліцыю. Цікава толькі, чаму ахоўнікі правапарадку самі не дадумаліся арганізаваць усё разам з намі. Ведалі ж, які попыт на білеты. Няўжо папярэднія матчы Лігі чэмпіёнаў не навучылі?!

Білеты хоць і каштавалі не танна (ад 20 да 70 тысяч рублёў), але раскупілі ўсе. У Мінск прыехаў каралеўскі клуб!

Былі і балельшчыкі іспанцаў, якія з'ехаліся ў Беларусь не толькі з Іспаніі, але і з Масквы, Украіны.

Самі футбалісты "Рэала" пасяліліся ў адной з цэнтральных сталічных гасцініц. Прывезлі з сабой нават асабістага повара. А снедалі ў асобнай зале рэстарана. Тым часам ахоўнік адганяў ад зорак футбала тых, хто жадаў узяць у іх аўтограф. Для прафесіяналаў няма дробязей. Нават прывезлі з сабой шмат бутсаў для рознага надвор'я, якое магло б памяняцца ў любы момант.

"Настрой перад матчам цудоўны, — канстатаваў перад гульнёй галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка. — Жадаем узяць рэванш. Не сумняваюся, што ігракі "Рэала" таксама жадаюць перамагчы. Але і нам хочацца патрапіць у плэй-офф. Пакуль ёсць хоць адзін шанц, за яго патрэбна чапляцца".

Як паказала гульня, клас ёсць клас. Нягледзячы на зусім не іспанскае надвор'е (у Мінску быў мароз) "Рэал" дамініраваў на працягу першых 10-15 хвілін. Затым пайшла гульня як быццам бы на роўных. ад і БАТЭ. Але спадзевы на тое, што іспанцы, многія з якіх напэўна і не бачылі столькі снегу, "замерзнуць" не апраўдаліся. Ужо на сёмай хвіліне, пасля адзінай за першыя сорак пяць хвілін грубай памылкі абароны беларусаў, Рауль адкрыў лік у сустрэчы...

Увогуле, у супрацьстаянні з БАТЭ "Рэал" глядзеўся памайстэрску. Беларусы спрабавалі змагацца з імянітым сапернікам, але на сённяшні дзень рэаліі беларускага футбола такія — нам рана на роўных гуляць з грандамі сусветнага футбола. Можна проста аддзячыць футбалістам за тое, што яны падарылі беларускім балельшчыкам свята — выступленне ў Лізе Чэмпіёнаў. Дзякуй БАТЭ! Менавіта стараннямі завадской каманды з Барысава ў Еўропе вырасла павага да Беларусі. А вось у самой Беларусі пра ўсё беларускае чамусьці стараюцца не ўзгадваць. Вы маглі ўявіць, каб у Германіі ці Францыі рэпартаж аб футбольным матчы ішоў на мове чужой краіны? Канечне, не! А ў нас, на вялікі жаль, — гэта рэальнасць, бо каментатар вёў рэпартаж. Ну што тут казаць: БТ — не БАТЭ...

Алесь СІВЫ,
Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗА КРАТАМІ

Эмануіл Зельцэр патрабуе незалежных урачоў

Як стала вядома "Народнай волі", стан здароўя амерыканскага грамадзяніна Эмануіла Зельцэра, які знаходзіцца ў магілёўскай калоніі, значна пагоршыўся.

Нагадаем, што ў жніўні гэтага года спадар Зельцэр быў асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў калоніі агульнага рэжыму быццам бы за камерцыйны шпіянаж і выкарыстанне падробных дакументаў. Зараз амерыканскі грамадзянін знаходзіцца ў Магілёўскай калоніі.

"Спачатку Эмануіла Зельцэра наведалі ў калоніі прадстаўнікі амерыканскага пасольства, а напрыканцы мінулага тыдня з'ездзіў туды і я, — распавядае адвакат Эмануіла Зельцэра Дзмітрый Гарачка. — Стан здароўя яго, безумоўна, вельмі кепскі. Пастаянна скардзіцца на болі ў нагах і спіне, павышаны ціск... Але ўрач турэмнай бальніцы кажа, што стан здароўя ў Зельцэра здавальняючы. Таму зараз мы працуем над тым, каб майго кліента паўторна агледзелі незалежныя ўрачы".

Нагадаем, што Злучаныя Штаты Амерыкі дабіваюцца вызвалення свайго грамадзяніна з беларускай турмы, а міжнародныя праваабарончыя арганізацыі нават заклікалі Міжнародны валютны фонд не выдзяляць Беларусі крэдыт у 2 мільярды долараў да таго часу, пакуль Зельцэр не будзе вызвалены.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2008 г.

РЕЗОНАНС

Две недели, которые потрясли Беларусь

Ровно две недели прошло с того дня, когда у президента Республики Беларусь А.Лукашенко состоялось совещание по вопросам борьбы с коррупцией, которое буквально потрясло Беларусь. Страсти продолжают кипеть в чиновничьих кабинетах и в заводских курилках, в академических лабораториях и в студенческих общежитиях, на деревенских посиделках и на городских кухнях...

Словно порох вспыхивают споры-дискуссии вокруг новых фактов, эпизодов, становящихся известными благодаря компьютерной паутине, которая, похоже, опутала многие слои населения. Создается впечатление, что на момент обличительного выступления Александр Григорьевич и сам не все до конца знал. Вспомним, что он говорил о прокуроре Минской области Михаиле Снегире.

Элитный дом по улице Грибоедова, квартира в котором стала камнем преткновения.

Вот тот коттедж В.Сидоровича, о котором идет речь в письме А.Зубовского на имя президента и генпрокурора.

Как покупалась квартира у иностранной фирмы "Шве-Бел Партнер"

"...11 мая 2007 года Снегирь приобретает у иностранной фирмы "Шве-Бел Партнер" пятикомнатную квартиру в центре Минска. Общей площадью больше 200 квадратных метров с подземным гаражом. Казалось бы, купил себе — ну и купил.

Но первый вопрос, который должен был появиться: в центре Минска 200 "квадратов", подземный гараж. Где взял деньги? Обычный чиновник, где ты взял деньги? Или мы не знаем, сколько стоила в 2007 году такая квартира в центре Минска? Да любого из вас сейчас подними, вы назовете точную рыночную цену такой квартиры. Или нет?

Но, во-первых, Снегирь приобретает квартиру у человека, который на момент покупки не имел права представлять эту фирму и вообще был уволен по сокращению штатов еще месяц назад до покупки. Это что, трудно было сопоставить?

Во-вторых, данная квартира не могла быть продана юридическим лицом, поскольку на момент сделки в ней проживал сотрудник фирмы по фамилии Сидорович. К тому же у него был заключен договор аренды с фирмой сроком до 2024 года.

Если уж очень прокурору хотелось купить и существуют вот эти вещи, то осторожный человек просто не полезет, потому что обязательно будет конфликт, скандал. Который выплеснется в общество.

В-третьих, квартира приобретена по заниженной в несколько раз стоимости — всего за 156 миллионов рублей. Ее рыночная стоимость тогда была более 500 тысяч долларов.

Чтобы придать сделке видимость законности, Снегирь оформил подложное дополнительное соглашение к договору купли-продажи, где оговорена уже другая стоимость квартиры — 535 миллионов рублей. Меньше чем 500 тысяч, но уже и не 156 миллионов. Однако и это соглашение нигде в установленном порядке не зарегистрировано, юридической силы не имеет, а деньги никуда не перечислялись и не поступали.

По всем этим фактам имеются подтверждающие документы. Когда проживающий в квартире Сидорович обратился в суд Центрального района Минска, то, Валентин Олегович (Сукало), какую, Вы думаете, позицию заняли судьи Ильина, Есьман, Павлючук? Не знаете? Позицию справедливости и законности? Отнюдь нет!

Судья Ильина, согласовывая по телефону со Снегирем последовательность действий, 4 августа 2008 года выносит решение в его пользу.

А судьи Есьман и Павлючук принимают решения наложить взыскание уже на съемщика квартиры Сидоровича за якобы "самовольную перепланировку квартиры". Проверили, никакой перепланировки не было. Сидорович восемь раз обращался в Генеральную прокуратуру с жалобами на противоправные действия Снегиря. Туда же направлялось из Швеции и ходатайство от фирмы "Шве-Бел Партнер". И что вы думаете? Никакого ответа!

Почему? Да потому, что все документы списывались в дело заместителем Генерального прокурора Куприяновым, который находился в дружеских отношениях со Снегирем.

Я сознательно в деталях расписал эти квартирные махинации, чтобы показать ту степень беспардонности, до которой докатились некоторые высокопоставленные работники судебной и правоохранительной систем..."

***

Казалось бы, люди президентского окружения, готовившие это совещание, снабдили главного борца с коррупцией неопровержимыми фактами. Громом отозвались они вечером 13 ноября у миллионов белорусов, замерших у телевизоров. Но уже спустя несколько дней наиболее любопытному электорату, тем, кто, кроме телеящика, имеет в доме еще и компьютер, стало ясно: есть у "снегиревской истории" и другая сторона медали. О ней те же белорусы, но уже не все, узнали из известного веб-сайта TUT.BY.

Руководитель "Шве-Бел Партнер" обратился к президенту и генпрокурору

"18 ноября в редакцию TUT.BY пришло письмо от председателя правления АО "SWE BEL Partner AB" Анатолия Зубовского, — поведал спустя несколько дней после президентского совещания популярный интернет-портал. — Руководитель предприятия сообщил, что направил обращения в Администрацию президента и Республиканскую прокуратуру в связи с событиями, о которых стало известно на прошлой неделе на совещании по вопросам коррупции. *"Представленная Вам информация по квартире г-на Сидоровича лжива и недостоверна,* — пишет Зубовский президенту. — *Именно тот, кто Вам ее преподнес, возможно, получил от "бедняка" Сидоровича солидный "куш".*

Напомним, на совещании 13 ноября Александр Лукашенко потребовал освободить от занимаемых должностей прокурора Минской области Михаила Снегиря и заместителя генерального прокурора Николая Куприянова, а также возбудить в их отношении уголовные дела. Причиной такого решения президента стала незаконная сделка по приобретению уже бывшим прокурором области недвижимости в центре Минска. Снегирь, рассказал президент, купил 5-комнатную квартиру за 156 млн рублей, при этом до 2024 года действовал договор аренды между "SWE BEL Partner AB" и сотрудником указанной фирмы В.Сидоровичем.

TUT.BY связался по телефону с Анатолием Зубовским, и тот изложил свою точку зрения на произошедшее.

— *Мне обидно и больно, что из-за наших отношений с Сидоровичем пострадали люди. И видел Снегиря лишь раз в своей жизни — 15 лет назад... Я могу подтвердить, что он полностью расплатился с нами, заплатив фирме 250 тысяч долларов... Каждое свое слово я могу подтвердить документами, за подписями Владимира Сидоровича. А Сидорович — совсем не такая "бедная овечка", как о нем говорят,* — рассказал А.Зубовский.

Председатель правления АО "SWE BEL Partner AB" пояснил, что руководство приняло решение продать квартиру, чтобы выйти из сложного финансового положения, в котором оказалась фирма по вине именно Владимира Сидоровича. При этом самому Сидоровичу руководство фирмы неоднократно предлагало продать квартиру за 150 тысяч долларов, при том, что ее рыночная стоимость составляла 500 тысяч долларов США.

В настоящее время А.Зубовский находится за пределами Беларуси — *"по причинам, которые касаются только меня и моей семьи"*. По словам Зубовского, В.Сидорович находится в Беларуси, но его личностью "почему-то никто не интересуется".

Как сообщил А.Зубовский, АО "SWE BEL Partner AB" в настоящее время находится в стадии инициированного банкротства.

Ниже приводим текст обращения Анатолия Зубовского, направленного президенту и генпрокурору.

"Уважаемый господин Президент!

Обращаюсь к Вам в связи с Вашим выступлением по вопросам борьбы с коррупцией в силовых структурах от 13 ноября текущего года.

Я, Зубовский Анатолий Степанович, с 1994 года и по настоящее время — председатель правления фирмы АО "SWE BEL Partner AB". Я работал совместно с г-ном Сидоровичем В. в фирме АО "SWE BEL Partner AB" с 1995 по 2002 год. Все это время Сидорович являлся не просто рядовым сотрудником в должности финансового директора, но и ее владельцем. Ему принадлежало 40% акций АО "SWE BEL Partner AB" и всех других фирм, входящих в холдинг.

В декабре 2001 года г-н Сидорович по собственному желанию вышел из бизнеса и получил 40% всех активов холдинга, порядка 20.000.000 долларов США, в том числе:

Офис в Москве, полиграфическую фабрику в Санкт-Петербурге, фирму по ремонту нефтяных скважин в Тюмени, две квартиры в Москве, три квартиры в Минске, акции фирм на Кипре и в Австрии, завод по производству метизов в Литве и другие активы. В январе 2002 года в результате внутренней проверки было установлено, что г-н Сидорович, являясь финансовым директором, перевел 8.000.000 долларов США со счета холдинга по неизвестным бесконтактным адресам. В связи с этим раздел холдинга был приостановлен, начались судебные разбирательства, которые продолжаются и сейчас. Так, в частности, в настоящее время на Кипре рассматривается иск к г-ну Сидоровичу на сумму 24.500.000 долларов США, присвоенных им лично и фирмой "Fagapito — LTD".

Квартира, в которой, как Вам доложили, проживал "бедный сотрудник" Сидорович, была передана ему в аренду. Начиная с 2002 года и по май 2007 ему неоднократно предлагалось купить эту квартиру за 150.000 долларов США, но он это делать отказался, видимо потому, что от "бедности" своей построил коттедж в районе водохранилища "Птичь", присвоил незаконно еще одну квартиру в этом же доме, которую продал.

В связи с вышеизложенными обстоятельствами, в мае-июне 2007 года эта квартира была продана г-ну Снегирю М. за 535 млн белорусских рублей (в эквиваленте 250.000 долларов США). Деньги были получены от покупателя в полном объеме.

Не в моей компетенции разбираться и оценивать степень коррупции, участие в ней конкретных лиц, я просто хочу обратить Ваше внимание на то, что представленная Вам информация по квартире г-на Сидоровича лжива и недостоверна. Именно тот, кто Вам ее преподнес, возможно, получил от "бедняка" Сидоровича солидный "куш".

Цель моего обращения одна: если Вы будете заинтересованы в правде по данному вопросу, прошу Вас поручить незаинтересованным и порядочным людям разобраться в этом. Со своей стороны я готов предоставить всю необходимую информацию.

С уважением!

Председатель Правления АО "SWE BEL Partner AB"
Анатолий Зубовский.

Справка

Анатолий Степанович Зубовский с 1984-го по 1991 год возглавлял Мозырский НПЗ. Трудовой путь начал старшим оператором установки на МНПЗ, работал начальником установки, начальником цеха, главным специалистом, руководил партийной организацией; после МНПЗ работал в АО "Славнефть"; являлся директором концерна "Славнефтепродукт", а также председателем совета директоров футбольного клуба "Славия". Почетный гражданин города Мозыря.

***

Не в компетенции "Народной воли" оценивать виновность или невиновность того или иного фигуранта нашумевшего скандала. Но что бросается в глаза: не исключено, президенту страны понадобится еще одно совещание, чтобы расставить все точки над "i". Полагаем, он обратил внимание на заключительный абзац письма председателя правления АО "SWE BEL Partner AB" Анатолия Зубовского: ***"Цель моего обращения одна: если Вы будете заинтересованы в правде по данному вопросу, прошу Вас поручить незаинтересованным и порядочным людям разобраться в этом. Со своей стороны я готов предоставить всю необходимую информацию".***

Анатолий Зубовский просил помощи у Зенона Ломатя

Многие из читателей наверняка заострили внимание на таком фрагменте "подводки" сайта TUT.BY: в настоящее время А.Зубовский находится за пределами Беларуси — *"по причинам, которые касаются только меня и моей семьи"*. По словам Зубовского, В.Сидорович находится в Беларуси, но его личностью "почему-то никто не интересуется".

В громогласном выступлении президента страны не содержится каких-либо подробных сведений о господине Сидоровиче. Не ставит первое лицо государства и вопроса: а почему наши доблестные органы не поинтересуются более тщательно этим фигурантом дела? Скорее всего, кто-то из ближайшего президентского окружения устно ввел Александру Григорьевичу в уши, что "нехорошо прокурору обижать хорошего человека по фамилии Сидорович". Вряд ли Александр Григорьевич знает и о том, что тот же А.Зубовский, но уже как директор фирмы Slavnefteproduct Ltd, обращался в Комитет государственного контроля Республики Беларусь с таким письмом (*сохраняем орфографию и синтаксис.* — **Ред.**).

Комитет государственного контроля Республики Беларусь

Уважаемые господа!

Обращаюсь к Вам с официальным заявлением об оказании содействия в привлечении к ответственности за мошенические действия гражданина Республики Беларусь Сидоровича В.Е. 1955 г.р., проживающего по адресу г.Минск, ул.Грибоедова, 2-10.

Начиная с 1996 г. и по 2001 г. гр-н Сидорович В.Е. являлся владельцем 40% акций Slavnefteproduct Ltd (Кипр), Swe-Bel Petroleum Ltd (Кипр), Ruhr Oil and Gas Ltd (Кипр) и финансовым директором этих фирм.

Пользуясь единоличным правом подписи Сидорович В.Е. в течении этого времени перевел на фирму Fagapito Ltd (Кипр), владельцем которой он является, из оборота вышеназванных фирм более 24.000.000 долларов США и далее использовал на собственные цели.

На все требования к Сидоровичу В.Е. объяснить целевое назначение сделанных им перечислений ответа не было получено. При этом в своих обращениях Сидорович В.Е. подтверждает их использование и просит снять наши требования заключением мирового соглашения (копия предложенного Сидоровичем В.Е. мирового соглашения прилагается).

В настоящее время фирмы Slavnefteprodurt Ltd и Ruhr Oil and Gas Ltd предъявили иски к фирме Fagapito Ltd и лично к г-ну Сидоровичу В.Е. на указанную сумму (копии исков прилагаются). Дело рассматривается в суде Республики Кипр.

В тоже время считаю необходимым проинформировать Вас о том, что г-ном Республики Беларусь Сидоровичем В.Е. присвоены значительные средства и тем самым нанесен ущерб не только указанным фирмам, но и бюджету Республики Беларусь, т.к. данные суммы не предъявлены для уплаты подоходного налога.

По имеющейся информации гр-н Сидорович В.Е. использовал эти средства для покупки предприятий, недвижимости и т.п..

Просим Вашего содействия в возврате денежных средств, присвоенных г-ном Сидоровичем В.Е.

С уважением,

Директор фирмы Slavnefteproduct Ltd Зубовский А.С.

"Незаинтересованные и порядочные люди" А.Лукашенко вполне могут заинтересоваться: а как отреагировали в Комитете государственного контроля Республики Беларусь на письмо директора фирмы Slavnefteproduct Ltd А.Зубовского? То, что вчерашние компаньоны по бизнесу ведут серьезнейшие разборки, подтверждает и письмо В.Сидоровича тому же А.Зубовскому:

"Swe BeL Partner AB"
04.04.2007

Председателю правления
Зубовскому А.С.

Уважаемый Анатолий Степанович!

Я пытался несколько раз позвонить Вам, но не смог дозвониться, вел переговоры с Барановым, и хотел бы выразить свою готовность довести договоренности о мировом соглашении. Длительные судебные разбирательства могут быть выгодны адвокатам, обслуживающим процесс, либо иным лицам, но для меня приоритетно скорейшей разрешение ситуации к удовлетворению обоих сторон.

Прочитав Ваше письмо от 31.01.2007г, у меня сложилось впечатление, что Вы фактически отказываетесь от достигнутых договоренностей по мировому соглашению в Вене и предлагаете рассмотреть новые условия, которые не были изложены.

Я предлагаю вернуться к соглашению, достигнутому в Вене и на основе его продолжить переговоры по заключению мирового соглашения.

Направляю Вам проект: «Принципы мирового соглашения», на основе которого австрийские адвокаты могли бы подготовить само соглашение.

Приложение на 2 листах.

В. Сидорович

Те из читателей, которых интересуют детали проекта такого документа, как "Принципы мирового соглашения", могут заглянуть на сайт "Народной воли" www.nv-online.info и удовлетворить свое любопытство. Для тех, у кого пока еще нет доступа в интернет, скажем: речь действительно идет о крупных (в десятки миллионов долларов) финансовых разборках. Кому, сколько и какая сторона возместит, кто потеряет, а кто найдет (в случае, конечно, заключения мирового соглашения) — дело будущего. Если же "друзья по миллионам" не найдут общего языка, не исключено, до нас дойдут отголоски еще не одного громкого процесса. К грандиознейшему конфликту имеют отношение не только наши соотечественники, но и гражданин России В.Ф.Мясников, которого, говорят, связывают с тем же Сидоровичем не только бизнес, но и служба в особых подразделениях, правда, разных государств. Оказывается, Владимир Евгеньевич Сидорович родился в 1955 году в поселке Октябрьский Гомельской области. Окончил институт железнодорожного транспорта, затем курсы КГБ. Служил в Мозыре и Жлобине. Случайно ли пересеклись пути-дорожки с А.Зубовским? Может, и случайно. Хотя вполне возможно и то, что их отношения берут начало еще с тех времен, когда Анатолий Степанович Зубовский возглавлял Мозырский нефтеперерабатывающий завод, а Владимир Евгеньевич Сидорович, имея уже погоны чекиста, присматривал кое за кем на том же Полесье.

Впрочем, мы отошли в сторону от главной темы — от ставшего уже историческим совещания у главы государства по вопросам борьбы с коррупцией. Разгорячившись, Александр Григорьевич тогда рубанул: *"...Генеральному прокурору сегодня, к исходу дня, внести представление об освобождении заместителя Генерального прокурора Куприянова* (который якобы покрывал Снегиря. — **Ред.**) *и прокурора Минской области Снегиря от занимаемых должностей. Возбудить уголовное дело и в рамках уголовного дела пройти все ступени, в том числе и морального плана.*

Председателю Верховного Суда, Государственному секретарю Совета Безопасности и Генпрокурору еще раз изучить материалы рассмотренных судом Центрального района Минска дел по квартирным искам Снегиря и Сидоровича. Рассмотреть вопрос об обоснованности приостановления решения Высшего Хозяйственного Суда Республики Беларусь от 24 июля 2008 года. В течение ноября принять законное решение.

Все незаконные решения незамедлительно должны быть отменены!

В установленном порядке Председатель Верховного Суда должен освободить от занимаемых должностей судей Ильину, Есьмана и Павлючук".

Как отозвалось слово президента? Во многих средствах массовой информации уже сообщалось: *"Николай Куприянов освобожден от должности заместителя Генерального прокурора, а Михаил Снегирь — от должности прокурора Минской области".*

Возбуждено ли уголовное дело? Возбуждено. К сожалению, нам не удалось связаться с тем же Снегирем, чтобы узнать, "на каком небе он находится". Молчат в прокуратуре страны о реакции на письмо А.Зубовского.

В печати промелькнуло интервью адвоката Сидоровича Игоря Суслова. Особо не распространяясь о своем подопечном, он, конечно, представляет его явно потерпевшим. Хотя ни слова не говорит о том, что, например, озвучил А.Зубовский. На вопрос, кто в настоящее время живет в *"спорной"* квартире, ответил: *"Сидорович выселился после вступления решения суда в законную силу".*

"Народная воля" имеет копию определения суда Центрального района г.Минска, связанного с рассмотрением материалов *"исполнительного производства №1767 о взыскании с Сидоровича Владимира Евгеньевича суммы в размере 26.750.000 рублей в доход государства".* На момент вынесения такого определения последним не была погашена *"задолженность в полном объеме по указанному исполнительному листу".* Суд решил *"наложить арест на автомобиль Мерседес-Бенц 320 JL, гос.номер 7117 MI, 2007 года выпуска, цвет черный, зарегистрированный за Сидоровичем Владимиром Евгеньевичем, 27.08.1955 года рождения, прописанного по адресу: г.Минск, ул.Грибоедова, 2-10, задержать указанный автомобиль, поместить на штрафную стоянку, изъять технический паспорт".* В минувший вторник мы позвонили в УГАИ ГУВД Мингорисполкома и спросили, исполнено ли определение суда. Внятного ответа не получили.

Как не получила "Народная воля" внятного ответа и на вопрос, возбуждено ли уголовное дело в отношении В.Сидоровича после ставшего широко известным письма А.Зубовского: *"Пока прокуратура воздерживается от каких-либо комментариев по этому вопросу".*

А какова судьба судей Ильиной, Есьмана и Павлючук? Благо, Центральный суд г.Минска находится в нескольких сотнях метров от редакции и позавчера один из наших сотрудников переступил его порог. Узнал, что судья Павлючук находится на больничном, остальные продолжают работать.

Упаси Господи подумать, что "Народная воля" желает кому-нибудь "секир башка". Но "Народная воля", как и обещала читателям, будет внимательно следить за ходом событий, связанных с громким совещанием по вопросам борьбы с коррупцией у президента Республики Беларусь.

Отдел журналистских расследований редакции газеты "Народная воля".

P.S.

Когда материал уже был заверстан в полосе, редакции "Народной воли" стали известны некоторые обстоятельства знакомства А.Зубовского с В.Сидоровичем. Их "свел" человек, работавший в органах КГБ. На то время В.Сидорович уже был уволен из рядов спецслужбы. Не думал тогда А.Зубовский, что их бизнес-отношения могут дойти до судов целого ряда европейских стран.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2008 г.

СКАЗАНО!

Александр ЛУКАШЕНКО:

— Когда они (нерадивые родители, не желающие восполнять государству затраты на содержание их детей. — Ред.) будут поставлены в такие условия, они тысячу раз подумают, или им жить в прежних условиях, или будут здесь работать. Норму не выработал, два замечания, на третье — в трудовой лагерь, а там самые жесткие условия. Вот тогда они будут трястись и бояться, и они будут лучше работать принудительно, выполнять три нормы за сутки, чем они попадут в такой лагерь. Если бы это было сделано, я уверен, мы бы таким образом не обсуждали эту проблему. За год ситуация изменилась бы!

(Из выступления на совещании по вопросу выполнения Декрета от 24 ноября 2006 года №18 "О дополнительных мерах по государственной защите детей в неблагополучных семьях".)

БЛИЦ-КОММЕНТАРИЙ

Построить трудовые лагеря, где будут "самые жесткие условия", конечно же, проще, чем искоренить причины, способствующие тому, что в стране с каждым годом становится все больше и больше родителей, не занимающихся в силу своей деградации содержанием и воспитанием детей. Но сегодня государство бросит в лагеря десять тысяч падших отцов и мамаш, а завтра подобных будет насчитываться в несколько раз больше. Что, с каждым годом расширять сеть "трудовых лагерей"?

Не отказываясь от ужесточения требований к бестолковым родителям, из-за беспробудного пьянства и тунеядства забывшим об исполнении своих прямых обязанностей, государство все же должно видеть в этом зле и свою вину. А все ли оно делает, чтобы люди всегда оставались людьми, чтобы радость жизни они видели в детях, а не в бутылке "чернила", которые сегодня чуть ли не дешевле минеральной воды? А сколько еще вопросов остается без ответов...

Чтобы в нашей стране все дети были счастливыми, нужно сделать еще очень и очень многое. И одними "трудовыми лагерями" для родителей-заблуд тут не обойтись.

ФАКТ

Твои дети — ты и плати

Вице-премьер Республики Беларусь **Александр КОСИНЕЦ** отметил, что родителей, чьих детей воспитывает государство, прежде всего характеризует асоциальное поведение, они часто страдают алкоголизмом, лишь 20% из них имеют специальное образование, а 80% не имеют практических навыков для работы. 70% обязанных лиц — женщины. Государство в среднем тратит на воспитание одного ребенка 194 тысячи рублей в месяц. В настоящее время социальными сиротами в стране являются 31.300 человек.

А.Косинец заявил, что государство сделает все необходимое, чтобы горе-родители воспитывали своих детей сами или возмещали затраты государства на их воспитание. **"Кто не умеет работать, того мы научим. Кто не хочет, того заставим. Кто страдает от алкоголизма, того вылечим. Ну а на кого все вышеперечисленное не подействует, тот отправится в места лишения свободы".**

АСОБА

Хутчэй папраўляйцеся, Уладзімір Аляксеевіч!

Як пачуваецца зараз наш знаны пісьменнік Уладзімір Арлоў? Пры нядаўнім вяртанні з паездкі ў Лондан ён мусіў адразу з трапа самалёта перасесці ў машыну "хуткай дапамогі". Пра стан здароўя Арлова пытаюцца чытачы "Народнай волі" — гарачыя прыхільнікі таленту пісьменніка.

На шчасце, тая "хуткая" аказалася шпаркаю хуткай, а рукі хірурга Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра "Кардыялогія" Алега Паланецкага, які на пачатку лістапада паспяхова правёў аперацыю на сэрцы Уладзіміра Аляксеевіча, залатымі.

Пісьменнік патэлефанаваў у рэдакцыю з просьбай перадаць глыбокую падзяку служыцелям медыцыны за іх высокапрафесіянальную працу і чалавечую дабрыню. А таксама — калегам-літаратарам, дыпламатам, усім сябрам, знаёмым і незнаёмым людзям за тое, што падтрымлівалі яго сваімі наведваннямі, тэлеграмамі, тэлефанаваннямі, эсэмэскамі...

Днямі Уладзіміра Арлова наведаў славуты беларускі святар айцец Аляксандр Надсан.

Рады паведаміць: паступова Уладзімір Арлоў ачуньвае пасля аперацыі. Зараз ён знаходзіцца ў Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі, дзе прабудзе некалькі тыдняў, і дзе ўжо зараз працягвае працу над новымі творамі.

Хутчэй папраўляйцеся, Уладзімір Аляксеевіч! Прыхільнікі вашага таленту жадаюць вам доўгіх творча плённых гадоў і чакаюць новых сустрэч з вашымі захапляльнымі творамі.

Яніна ЗАЛЕСКАЯ.

РЭДКІ ЧАЛАВЕК

«Бэнээфавец» Іван Яцына

У вёсцы Івана Антонавіча Яцыну называюць "бэнээфаўцам". За тое, што ён мае сваю пазіцыю, што пастаянна ездзіць у Мінск на мітынгі і што спадзяецца больш на свае рукі, чым на дзяржаўную дапамогу.

Сама вёска Ліпкі, што ў Дзяржынскім раёне, ужо аджывае. Дванаццаць хатак, невялічкі магазін... Іван Антонавіч пераехаў сюды з Мінска на непрацяглы час, ды так і застаўся. Рукі ў яго залатыя, так што чалавек не згубіўся.

— У мяне 17 сем'яў пчол, — сустракае мяне гаспадар і расказвае пра сваю гаспадарку. — Сам навучыўся даглядаць за пчоламі яшчэ малым. Толькі падчас майго знаходжання ў арміі тата гэтым займаўся. Але працаваў ён механізатарам, часу ў яго было няшмат. А калі бацька памёр, то я тых пчолак і забраў. І з-за іх, па сутнасці, і купіў гэтую хату. Трэба было недзе вуллі паставіць. І ўсё, што вы зараз бачыце, зроблена маімі рукамі.

У Ліпках Іван Антонавіч і нарадзіўся. Адсюль пайшоў служыць у армію. Адслужыў тры з паловай гады, а затым па просьбе самога генерала застаўся на звыштэрміновую. Людзей не хапала. Пасля арміі прыехаў у Мінск, уладкаваўся на працу, ажаніўся.

— Усё жыццё адпрацаваў на пад'ёмных кранах, але ў розных арганізацыях, — кажа мой суразмоўца. — Ніколі не было ніводнага прагула, ніякіх скаргаў на дысцыпліну. І толькі пасля 2000 года, калі пайшоў на пенсію, вырашыў з'ехаць у вёску. Купіў гнілую хатку за 600 рублёў. Але паціху будаваўся. Толькі смецця цэлы трактарны прычэп адсюль выцягнуў. Але была зямля. А жонка працавала ў Мінску на малочным заводзе і атрымлівала 50 рублёў у месяц, тады ў простых людзей такія зарплаты былі. Праца была цяжкая, і мы вырашылі, што за тыя грошы не варта горб нажываць. Звольнілася, на лета прыехала ў Ліпкі. Купілі спачатку курэй, затым кабанчыка. Я хату пабудаваў, сам з дзядзькам печку склаў, хлеў паставіў, лазню. Жонка глядзела тут за гаспадаркай, а я яшчэ працаваў, прыязджаў толькі па выхадных днях. А затым сын ажаніўся, дачка выйшла замуж. Пакінуў ім кватэру ў сталіцы і таксама ў Ліпкі. Малако сюды ў магазін прывозяць рэдка, таму пасля яшчэ і кароўку завялі...

Іван Антонавіч расказвае, што яшчэ з тых часоў, калі ён працаваў, ніколі не любіў несправядлівасці. Заўсёды стаяў гарой за праўду і за людзей.

— Апошнім часам у Мінску я працаваў на харчовым камбінаце, — успамінае ён. — Якраз Гарбачоў прыйшоў да ўлады, я тады нават ледзь у партыю не ўступіў. Новыя думкі, новае мысленне... Гарбачоў казаў, што патрэбны людзі, якія б не баяліся прыйсці да начальніка і стукнуць кулаком па стале. Думаю — калі так, то Гарбачову трэба дапамагаць. Таму што я бачыў, як мы марудна, але гніём. Бачыў, што паўсюль падман. На той жа будоўлі заўсёды па вушы ў брудзе. Я тры месяцы ў Барысаве працаваў з аўстрыйцамі, дык там жа залюбуешся! Пляцовачку разраўнялі, пясочкам пасыпаюць, вадзіцай, каб пылу не было, паліваюць... Ніхто не мацюкаецца, перакураў няма. На абед мікраўтобус прыехаў, усе паехалі есці ў вагончыкі з тэлевізарамі. Любата! Адным словам, хацелася мне, каб і ў нас так людзі жылі і працавалі. Да таго ж тады на савеце працоўнага калектыву старшынёй абралі мяне, простага кранаўшчыка. І мы пачалі весці сваю палітыку. Камуністы пераабралі сакратара парткама — на новую пасаду слесара прызначылі. Атрымалася такая сітуацыя, што ўлада на камбінаце аказалася ў руках рабочых. Пачалі нейкія рэформы праводзіць, прынялі рашэнне, каб адпачынак для ўсіх быў аднолькавы. Дакапаліся і да касы ўзаемадапамогі. Аказваецца, грошы пад гэты артыкул выдаткоўваліся кожны год, ды толькі не ўсе матэрыяльнай дапамогай карысталіся. І калі я займеў доступ да некаторых дакументаў (а мы дабіліся таго, каб бухгалтэрыя нам давала фінансавую справаздачу), аказалася, што там наогул жах што адбывалася. Асабісты шафёр дырэктара, напрыклад, паехаў на заробкі на месяц і яшчэ двайны аклад у якасці матдапамогі атрымаў. Іншыя начальнікі таксама сябе не крыўдзілі. Мы ўсё гэта абрэзалі.

— Не думаю, што начальству падабалася вашая актыўнасць...

Аднойчы ён заблукаў на старыя рускія мясцовыя могілкі. Мярзота запусцення, смецце, цвіль, пахілыя помнікі і крыжы, чужыя імёны... І тады падумалася: "І гэта я тут буду ляжаць, у гэтай чужой зямлі?" Мароз прабег па душы. Уражанне было такое моцнае, што, прыйшоўшы дадому, сказаў жонцы: "Усё! Едзем дадому! Вяртаемся ў Пінск! На Беларусь!"

І паехаў. Толькі як! Паплыў. Да Бацькаўшчыны трэба плысці, як карабель, доўга, упарта і пастаянна. Там наш порт і вечная гавань...

На сваёй яхце па рэках і вадаёмах Шатохін прыплыў з-пад Палярнага круга аж у Маскву. У Маскве яхту пагрузілі на чыгуначную платформу, шкіпер Шатохін залез у трум і паехалі ў Гомель пад стук калёс. У Гомелі карабель апусцілі ў Сож і адтуль — вецер у ветразі — поўны наперад у Пінск. Бацькаўшчына наплывала, як казка: балоты, палеская пойма навокал, старыя дубы з бусламі на верхавінах і воблакі пад беларускім свежым ветрам...

Сустракаць карабель на надбярэжжы Піны сабраліся родзічы, сваякі і знаёмыя. У бінокль здалёку было відаць, што іх шмат. Тады з борта ў неба паляцелі ракеты, усчалася цэлая кананада, а на беразе падкідвалі ўгару шапкі і капелюшы...

Так Яўген Шатохін (мастацкая натура) прыплыў да Беларусі. Ад чужых могілак — да сябе, з думкаю пра душу. Але засталося яшчэ дайсці. Дайсці да Беларусі.

І ён дайшоў. Дайшоў таксама ад могілак, дзе ляжаў расстраляны народ. 29 кастрычніка 1989 года ён апынуўся ў Курапатах разам з тысячамі людзей, што прынеслі туды сяміметровы Крыж Пакуты і ўсталявалі пад гукі рэквіема і малітоўны спеў. Тое, што ён там убачыў, перавярнула, як ён кажа, яго душу. З гэтага дня ён як нанова нарадзіўся, зразумеўшы, што жыць трэба для Беларусі і тварыць для яе. Усё, што рабілася, тварылася да гэтага дня, — здалося марным, нікчэмным і непатрэбным...

16 лістапада ў Амерыцы на вернісажы творчых прац Яўгена Шатохіна ў беларускім Саборы св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне Антон Шукелойць выказаў цікавае назіранне пра беларускі адраджэнскі рух і змаганне за незалежнасць. Усё ранейшае змаганне (заўважыў А.Шукелойць) узначальвалі лідэры-юрысты, эканамісты альбо прафесійныя палітыкі ("пэрстрыкто"). Але ў іх не атрымалася. Справа была правалена. У Новым Беларускім адраджэнні за справу вызвольнага змагання ўзяліся мастакі, і ў іх — атрымалася. Здабылі незалежнасць.

Сапраўды, Новае Беларускае адраджэнне ўзначаліла ў асноўным творчая інтэлігенцыя. У 60—70-х гадах у Мінску існавала моцная мастацкая адраджэнская група, якая часта збіралася "На паддашку" (у майстэрні мастака Яўгена Куліка). Шмат каго з гэтых асоб 19 кастрычніка 1988 года на Устаноўчай канферэнцыі "Мартыралогу" я прапанаваў у Аргкамітэт БНФ.

У Сойм БНФ першай паловы 90-х было выбрана больш за 10 мастакоў. Цікава, што камуністы гэта разумелі. Памятаю, не раз іхныя саркастычныя рэплікі ў мой бок у Вярхоўным Савеце. Маўляў, "всякие тут кандидаты искусствоведения", — грэбліва адзываліся яны, сакратары райкамаў, абкамаў ды старшыні калгасаў і іншы партгасактыў.

Яўген Шатохін — пастаянны сябра Сойму БНФ, пачынаючы з 90-х гадоў. Акрамя таго, уваходзіць яшчэ ў Паліткамітэт Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ. Яго навонкавае палітычнае захаванне — тыповае для адраджэнца: там, дзе Шатохін, там Бел-Чырвона-Белы сцяг. У Францыі ён маршыруе ў калоне французскіх ветэранаў з вялікім Беларускім сцягам, у Берліне ён са Сцягам на вакзале, на пленэры на радзіме Васіля Быкава ягоны Сцяг на высачэзнай мачце пануе над наваколлем. Словам, дзе б мы ні былі — гэта ёсць МЫ і гэта наш Сцяг у свеце.

Мастацкае аблічча Я.Шатохіна — гэта яго творчасць. Тэмы яго мастацтва — партрэты беларускіх людзей, краявіды Бацькаўшчыны, архітэктура ў краявідзе, родны горад Пінск, нацюрморты беларускай працы і асяроддзя (гарбузы, яблыкі, прылады працы, расліны і г.д.).

Найбольш працуе мастак у тэхніцы алоўка і акварэлі. Графічныя выявы яго (асабліва партрэты) вельмі выразныя. Выразнасць, вобразнасць і адметная манера штрыха — найбольш характэрныя рысы шатохінскай творчасці алоўкам. Ягоны почырк і выяўленчы стыль не зблытаеш ні з чыім іншым. Выразнасць дасягаецца таксама за кошт вельмі эканомнай лініі і ўмення ўключыць белы фон паперы ў кампазіцыю і перспектыву ўсёй карціны, шляхам дынамічнага размеркавання балансу светлых і цёмных плямаў.

Я.Шатохін валодае надзвычай патрэбнай і станоўчай якасцю прафесійнага мастака добрага класу — уменнем своечасова спыніцца. Пасля таго як зроблена асноўная мадуляцыя выявы, дасягнута выразнасць характару і чытальнасць вобразу, праца практычна спыняецца. Даводзіцца да ладу баланс белага і чорнага, кампазіцыя планаў, дынаміка светлацені (калі ёсць патрэба), паўтону, насычанасць штрыха — і ўсё на гэтым.

Ніводная праца Я.Шатохіна не пакідае ўражання "замучанасці" ці імкнення ўпрыгожыць прыгожае. Усё падпарадкавана асноўнай творчай задачы, і нідзе мастацкі густ не здраджвае аўтару.

Амаль усе партрэты мастака, выкананыя алоўкам, — гэта так званыя "галаўныя партрэты", буйны маштаб.

Вядома, мастаку лягчэй намаляваць такую выяву, але тут не ўцяканне ад цяжкасцяў, а вынік манеры і творчага падыходу, дзе выразнасць аблічча і характару дасягаецца ў максімальным павелічэнні кшталтам рэзкай мадуляцыі штрыха і пазбягання лішняга. Канцэнтрацыя толькі на галоўным. Вельмі характэрны ў гэтым сэнсе "Партрэт бабы Кацырыны". Тыпаж настолькі выразны і этнічна трансцэндэнтны, што, здаецца, сягае аж да каменнага веку. Адначасна нейкая стыхійная готыка ўгадваецца ў гэтым абліччы.

Тое ж у партрэце Алеся Шатэрніка, зробленага ў больш мяккай манеры, але нібы на адным дыханні (а так яно і было).

Вельмі запамінаецца "Партрэт дзядзькі Уладзімера Данілавіча". Тут малюнак больш дэталёвы, з увагай да паўтаноў. Партрэт надзвычай выразны па тыпажу: шапка-блін на ілбе, бульба-нос і вельмі самавіты, годны выраз твару беларуса-працаўніка, моцнага, крыху крытычнага да ўсяго, які ведае сабе цану.

Родны Пінск, архітэктурны ансамбль францысканцаў, што відаць з-за Піны, — улюбёны сюжэт Яўгена Шатохіна. Такіх сюжэтаў на выставе некалькі — у алоўку і акварэлі. Запамінаецца графічны ліст "У маім горадзе — Сакавік". Ліст вельмі прыгожа выштрыхаваны, але галоўнае — тут схоплена нейкае (усім нам знаёмае на Беларусі) таямнічае святло, якое прыўносіць у душу абставіны светлага камфорту і казачнай цеплыні.

Звяртаюць на сябе ўвагу лісты з вершамі Рыгора Барадуліна, напісанымі на выявах рукой паэта. Асабліва глыбокі адухоўлены партрэт Барадуліна ў вобразе мудрага добрага старога, аблічча якога у светлым німбе нібы выплывае з вечнасці і з фактуры ліста.

Акварэльныя лісты (у асноўным на тэму Пінска) удала ўпісаныя ў кампазіцыю выставы (якую скампанаваў сам мастак) і з'яўляюцца каляровымі акцэнтамі ўсяго экспазіцыйнага раду.

У нядзелю, 16 лістапада, на адкрыцці экспазіцыі сабралася добрая грамада беларусаў. Адчыніў урачыстасць Алесь Вінакураў, кіраўнік усёй выставачнай працы Беларускага музея ў Нью-Йорку. Гэта яго стараннямі быў запрошаны ў Нью-Йорк Яўген Шатохін, падрыхтаваныя буклеты, рэклама, тэксты, выдрукі, плакаты па-беларуску і англійску і іншае. Дапамагалі тэхнічна рыхтаваць экспазіцыю (як заўсёды, сваім коштам) Мікалай Сагановіч, Васіль Кузьменка і іншыя сябры-беларусы. Нагадваю пра гэта, бо ўся беларуская выставачна-музейная праца ў Нью-Йорку трымаецца на энтузіязме і з'яўляецца грамадскім рушэннем.

На адкрыцці выставы Яўген Шатохін распавядаў не толькі пра творчасць, але і пра жыццёвыя абставіны, што спадарожнічаюць творчасці мастака. Нарадзіўся Я.Шатохін у Пінску ў 1947 годзе. Сябра Саюза мастакоў Беларусі. Ён заснавальнік Пінскай дзіцячай школы выяўленчага мастацтва і з 1988 года быў яе дырэктарам. З 1989 года сябра Беларускага Народнага Фронту. У 1990—1999 гг. быў дэпутатам Пінскага гарсавета ад БНФ. Мае мастацкія ўзнагароды і медалі за сваё мастацтва. Выстаўляўся ў шматлікіх краінах Еўропы. Ягоныя працы ёсць у шмат якіх музеях, зборах, прыватных калекцыях па ўсім свеце.

Мастацтва Я.Шатохіна, як ён сам гэта ўяўляе і як гэта відаць, накіравана дзеля дабра, гонару і велічы Беларусі, якой прысвячаецца творчасць і ўсё мастацкае служэнне.

Зянон ПАЗЬНЯК,
кандыдат мастацтвазнаўства.

19 лістапада 2008 г.

У маім горадзе — сакавік. З нізкі «Я нарадзіўся тут...», 2008 г.



А.Шатэрнік. З нізкі «Творцы Беларусі», 2007 г.



Бацькаў вяз. З нізкі «Вушацкія аўтографы», 2006 г.



Партрэт Р.Барадуліна. З нізкі «Вушацкія аўтографы», 2006 г.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Аплата за навучанне павысілася больш чым на паўмільёна

Павышэнні коштаў закранулі некалькі прэстыжных ВНУ краіны — БДУ, БДЭУ і БНТУ. У многіх іншых навучальных установах павышэння аплаты чакаюць у канцы навучальнага года.

Для некаторых студэнтаў навіна стала ўдарам. У сярэднім кошты навучання ў тым жа БДУ і эканамічным універсітэце павысіліся на 20%.

"Новыя кошты на навучанне зацвердзілі з першага лістапада, — кажуць у бухгалтэрыі БДУ. — У пачатку гэтага тыдня быў падпісаны загад аб павышэнні аплаты. Кошты павысіліся на ўсіх факультэтах, у сярэднім на 20 працэнтаў". У бухгалтэрыі растлумачылі, што павысіць плату за навучанне было неабходна для таго, каб выплаціць заробкі выкладчыкам.

"З першага лістапада павялічылася тарыфная стаўка першага разраду для бюджэтных арганізацый, — працягваюць тлумачыць у бухгалтэрыі. — Так у нас павялічваюцца заробкі выкладчыкам, а яны ўключаны ў кошт навучання".

На такіх факультэтах БДУ, як філасофіі і сацыяльных навук, міжнародных адносін, журналістыкі кошты дзённага навучання ўзляцелі на 500—600 тысяч беларускіх рублёў.

З пытаннем "ці падымуцца кошты ў вас?" мы звярнуліся ў іншыя прэстыжныя ВНУ.

"Як? Аплата паднялася ўжо! — абразіліся на пытанне ў бухгалтэрыі БНТУ. — Значыцца так: аплата за год у сярэднім паднялася на 708 тысяч".

Студэнт-платнік будаўнічага факультэта БНТУ Сяргей расказаў, што многія небагатыя студэнты імкнуцца перавесціся на завочку — там кошты ўдвая меншыя.

"Кожны год павышэнні! Грошы зараз і так невядома куды дзяюцца, а такую аплату зрабілі — гэта зусім дрэнна, — скардзіцца Сяргей. — Лічыцца, чым больш мы будзем плаціць, тым больш нашу адукацыю будуць лічыць еўрапейскай. Але ж гэта не так. Многія студэнты не пацягнуць такую аплату, крэдыт падчас фінансавага крызісу ўзяць таксама няпроста. Некаторыя студэнты паспрабуюць перайсці на завочку пры першай магчымасці".

Апроч БДУ і БНТУ павышэнне аплаты адбылося і ў эканамічным універсітэце (БДЭУ).

Плату за навучанне паднялі і ў некаторых іншых універсітэтах, але на больш прымальную суму.

"Так, аплата павялічылася на тысяч сто-дзвесце, гледзячы які факультэт", — паведамілі ў прыёмнай Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта.

Чамусьці павышэнне платы за навучанне не закранула некаторыя іншыя прэстыжныя ВНУ, напрыклад, Акадэмію кіравання пры прэзідэнце, медыцынскі універсітэт. Не паднялі аплату і ў рэгіянальных дзяржаўных ВНУ. Студэнты прыватных навучальных устаноў таксама пакуль дыхаюць з палёгкай.

"У нас, напрыклад, на сацыяльнай педагогіцы аплата 906 тысяч, — кажуць у прыёмнай Інстытута сучасных ведаў. — У нас звычайна на павышэнне аплаты навучання загад падпісваецца. Пакуль такога загаду ў інстытуце няма".

У большасці універсітэтаў "Еўрарадыё" расказалі, што рэзкага павышэння аплаты чакаюць у канцы навучальнага года.

ТРАГЕДИЯ

Утонувших детей перепутали в морге

В санатории "Солнышко", что в Слуцком районе, утонули двое мальчишек. Возбуждено уголовное дело по статье "Служебная халатность", официальные лица через СМИ напомнили об опасности прогулок по первому льду. Однако у этой страшной истории было и иное продолжение.

Отец 8-летнего Ильи из Барановичей Сергей Анайеко позвонил в редакцию местной газеты "Інтех-Press" и рассказал, как к его детям относились в злополучном санатории:

— Путевки в санаторий "Солнышко" получила моя жена Светлана, которая работает помощником воспитателя детского сада от железной дороги. В санаторий мы отправили двух наших детей — 8-летнего сына Илью и дочь Илону.

Когда я привез сына и дочь в санаторий, деньги на их нужды хотел отдать на хранение воспитательнице. Но со словами "я здесь ни за что не отвечаю!" она отказалась. Если судить по словам дочери, то в санатории за детьми практически не смотрели, несмотря на то, что в путевке указано: воспитатели отвечают за детей от 7 до 14 лет.

В среду, когда утонул мой сын, дочь Илона заметила, что Илья долго отсутствует в санатории, и побежала предупредить об этом воспитательницу, которая пила чай. "Он, наверное, где-то на процедурах", — ответила та и, ничего не предприняв, продолжила пить чай...

Когда я пришел в морг, то в одежде Ильи мне показали тело чужого ребенка! Оказалось, что тело моего сына по ошибке отправили в Минск!

Я до вечера ждал, пока мне привезут моего Илью, жена в это время была в обмороке.

После того как в неограждённом водоеме, который находится всего в 50 метрах от санатория, утонуло двое малолетних детей, туда съехалось все начальство, сотрудники прокуратуры. Все чесали затылки и разводили руками, а при показаниях стали валить вину друг на друга. Я бывший милиционер и от таких запутанных показаний мне стало плохо.

Но я не хочу кому-то мстить за своего погибшего сына. Хочу просто предупредить других родителей, чтобы они были внимательны, отдавая своих детей в санатории на отдых.

НУ І НУ!

Праз мяжу на... матрацы

Як паведаміў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Аляксандр Цішчанка, 31-гадовы беларус быў затрыманы на ўчастку Брэсцкай пагранічнай групы. Імкнучыся нелегальна вярнуцца на радзіму з Польшчы, ён пераплыў Заходні Буг на двухмесным надзіманым матрацы. Пры сабе парушальнік меў два мабільныя тэлефоны, помпу і некаторую колькасць злотых.

У працэсе разбору высветлілася, што больш як год таму малады чалавек незаконна перайшоў украінска-польскую мяжу і за гэтае парушэнне на працягу года адбываў зняволенне ў Польшчы. Цяпер затрыманы афармлены як парушальнік мяжы. Мінімальнае пакаранне, якое яму пагражае, — штраф у 20 базавых велічынь.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Што каму па кішэні...

Чуў, што самым дарагім мінскім атэлем з'яўляецца "Еўропа". Цікава, а якія цэны ў іншых гасцініцах?

Уладзімір КАРПОВІЧ, г.Мінск.

Цэны ў гасцініцы "Еўропа і на самай справе "кусаюцца". Так, за аднамесны нумар у суткі прыйдзецца выкласці 308 еўра. Гэта самае таннае, што могуць вам прапанаваць. Аднамесны "дэлюкс" каштуе 364 еўра, "паўлюкс" — 455, апартаменты — 543, прэзідэнцкі нумар — 1104—1150 еўра.

У турэцкім атэлі "Growne Plaza" (былая гасцініца "Свіслач"), які адкрыўся не так даўно, нумары каштуюць менш — ад 210 да 715 еўра ў суткі.

У чатырохзоркавай гасцініцы "Мінск" аднамесны нумар каштуе 187 долараў, двухмесны — 216, трохмесны — 444, апартаменты — 838, прэзідэнцкі нумар — 1171 долар. Да таго ж за 247 у.а. тут можна зняць спецыяльны нумар для маладажонаў.

У сталічнай "Вікторыі" (таксама чатыры зоркі) нумары — ад 170 да 806 долараў.

Яшчэ больш танныя трохзоркавыя атэлі "Беларусь" і "Юбілейная". У "Беларусі" зняць нумар можна ад 64 да 372 долараў (для замежных грамадзян) і на 5—10 долараў менш для грамадзян з краін СНД. У "Юбілейнай" кошты вагаюцца ад 82 да 243 долараў у суткі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2008 г.

ОФИЦИОЗ

Владимир ЗАМЕТАЛИН:

«Мы сможем делать самостоятельно все то, что сейчас делает «Мосфильм»

На "Беларусьфильме" началась реконструкция, во время которой будет снесено все, кроме одного корпуса.

На месте снесенных строений будет возводиться новый универсальный производственный комплекс. В итоге "Беларусьфильм" получит 8000 квадратных метров павильонных площадей — это почти два футбольных поля.

Процесс полной замены оборудования на киностудии уже начался: проведено 60% закупок и работ в этом направлении. Именно современные технологии в производстве телепродукции больше всего радуют гендиректора киностудии **Владимира Заметалина**.

"Самое главное — уже с июля следующего года у нас будет возможность переводить цифровое кино на пленку, а пленочное — на цифру, — замечает он. — *Это будет для нас выгодно и с финансовой, и с прокатной точки зрения. К тому же киностудия хочет облегчить работу Министерству культуры, которое возит кинопроекционное оборудование в регионы. Если мы сможем выдавать в эфир любой фильм, то надобность в этих поездках исчезнет".*

Обещано, что 1 мая 2010 года реконструкция "Беларусьфильма" будет закончена. Но уже с 1 июля 2009 года киностудия, по словам ее руководства, сможет соперничать даже с "Мосфильмом".

"Мы сможем делать самостоятельно все то, что сейчас делает "Мосфильм" или "Саламандра", — заявляет Заметалин. — *Причем съемки на нашей киностудии будут обходиться дешевле, чем у них. Хотя у нас будет самое современное оборудование".*

Также киностудия надеется на сотрудничество с российским кинематографом. И в первую очередь со школами подготовки специалистов.

"Надеемся, Россия, умеющая готовить классных специалистов, окажет нам содействие, — объясняет Заметалин. — *Ведь школы по подготовке актеров, операторов, режиссеров у нас нет. Чем быстрее мы это признаем, как бы сложно это ни было, тем лучше будет".*

Валерия ЕСИНА.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Представляя новое белорусское кино, Владимир Заметалин в качестве сувенира презентовал «Народной воле» кусок ржавой водопроводной трубы.

Его Владимир Петрович специально принес с собой, завернув в газету "Рэспубліка".

"Вот этот предмет я покажу, чтобы вы понимали, в каком состоянии находится сегодня киностудия, — сказал Заметалин. — *Эта труба — часть водопроводных тепловых сетей киностудии "Беларусьфильм", которые не менялись с 1961 года...*

Я дарю это популярной газете "Народная воля".

"Народная воля" приняла этот "антиквариат" в свой музей, потому что не раз писала о том, в каком плачевном состоянии находится киностудия. Надеемся, что после ремонта за "Беларусьфильм" будет не стыдно не только внешне. Что снимать кино будут не исключительно "идеологически выдержанные" режиссеры. Что работники киностудии будут получать хорошие зарплаты. Что, наконец, появятся фильмы, достойные не только призов и одобрения "Лістапада", но и "Оскара". Ради этого "Народная воля" даже готова взять шефство над киностудией... Вместе — точно не пропадем!

Марина КОКТЫШ.
Фото photo.bymedia.net

КОРАТКА

Грузія перамагла на дзіцячым "Еўрабачанні"

Пераможцамі дзіцячага конкурсу песні "Еўрабачанне-2008" з сонечнага Кіпра з'ехала грузінскае трыо "Бзікебі", якое спявала на вынайдзенай імі мове ос. Двойчы выйграўшая дзіцячае "Еўрабачанне" Беларусь мела статус аднаго з фаварытаў конкурсу, але заняла шостае месца.

Правы чалавека ў Беларусі праз аб'ектыў фотакамеры

У гонар 60-годдзя Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека Хата правоў чалавека ў Вільні ладзіць конкурс на найлепшую фатаграфію, якая ілюструе ажыццяўленне якога заўгодна права ці свабоды чалавека ў Беларусі.

Паводле вынікаў конкурсу, у кожнай з намінацый будзе адабрана найлепшая фатаграфія, аўтар якой атрымае прыз -- паездку ў Вільню на двух чалавек на выхадныя альбо грашовую прэмію.

У Мінску праходзяць Дні польскага кіно

Да 30 лістапада ў сталічным кінатэатры "Цэнтральны" праходзяць Дні польскага кіно.

Сярод дэманстраваных карцін -- фільмы такіх рэжысёраў, як Вожыкі Штура, Анджэя Севярына, Лукаша Палкоўскага і Марэка Скрабецкага.

Пачатак усіх паказаў у 18.30.

«J:морс» сыграе песні з незапісанага альбома

Група "J:морс" зараз працуе над новым альбомам, выхад якога вызначаны на пачатак будучага года.

Частку новага матэрыялу можна будзе пачуць на сольным канцэрце з праграмай лепшых песень, які адбудзецца 18 снежня ў мінскім клубе "Рэактар".

Альтэрнатыва супраць СНІДу

Фэст альтэрнатыўнай музыкі "Музыкі супраць СНІДу" пройдзе 1 снежня, у Сусветны дзень барацьбы з чумой XX--XXI стагоддзяў у мінскім клубе "Рэактар". У мерапрыемстве прымуць удзел "Лялькі", "Рыкашэт", "Крок", "Sok", "Тарпач", "Партызон". Першым 300 слухачам, якія набылі квіткі, дыск ад БМА ў падарунак.

Мінск наведае чэмпіён Еўропы па вясельных фрызурах

Да 30 лістапада для ўдзелу ў VII выставе індустрыі прыгажосці і здароўя "Інтэрстыль 2008" Мінск наведае вядомы італьянскі цырульнік-стыліст, чэмпіён Еўропы па вясельных фрызурах Джанкарла Лаура.

Ён тры дні будзе працаваць на стэндзе разам з беларускімі майстрамі. Таксама ён падзеліцца з гасцямі выставы сакрэтамі нарошчвання валасоў.

Вольскі і «Ліцьвінскі хмель» уладкоўваюць «Дзень Максіма Багдановіча»

10 снежня ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі адбудзецца паказ музычна-пластычнай містэрыі "Дзень Максіма Багдановіча". Гэта сумесны праект фальклор-тэатра "Госьціца", ансамбля салістаў "Класік-Авангард", Лявона Вольскага і "N.R.M.", Яна Жанчака і "In Search For", групы "Ліцьвінскі хмель" і артыстаў мінскіх тэатраў.

ЭКСКЛЮЗИВ

Ирина ПЕТРОВСКАЯ:

«Ситуация на российском телевидении примерно такая же, как у вас...»

На минувшей неделе в Минске два дня провела известный московский телекритик Ирина Петровская. Несмотря на плотный график, Ирина Евгеньевна нашла время, чтобы пообщаться с корреспондентом "Народной воли".

— Ирина Евгеньевна, говорят, что вы — самый высокооплачиваемый обозреватель "Известий"...

— Своими заработками я довольна, но понятия не имею, как они соотносятся с зарплатами других журналистов. Думаю, существуют примерно одинаковые ставки для колумнистов. Наверное, по сравнению с рядовым репортером я — высокооплачиваемый сотрудник, а по сравнению с замами главного редактора — нет. Вообще, газетные зарплаты не идут ни в какое сравнение с телевизионными. Хотя, наверное, по сравнению с Беларусью — они супервысоки...

— Сколько часов в день вы смотрите телевизор?

— Бывают дни, когда вообще ничего не смотрю. Для того, чтобы писать о телевидении, не обязательно всасывать в себя, как в пылесос, все передачи. С 1992 года я существую в режиме конвейерного написания своей колонки, потому у меня огромный опыт телесмотрения. Как правило, изучая телепрограмму, я выбираю, что буду смотреть.

— Знакомы ли вы с белорусским телевидением?

— Я приехала на два дня и ничего толком не видела. Но что-то мне подсказывает, это не лучшее телевидение в мире...

— Как, по-вашему, можно охарактеризовать страну, где телевидение безальтернативно — представляет одну точку зрения?

— Как страну с авторитарным режимом, где нет свободы слова и нарушается основополагающий принцип журналистики — объективное исследование проблемы. Ни одна уважающая себя западная компания не выдаст в эфир материал, основанный на одном источнике. Если есть проблема, предполагающая наличие разных точек зрения, то обязательно предоставляется трибуна для всех существующих мнений...

Впрочем, ситуация на нашем телевидении примерно такая же, как у вас. Мы тоже редко можем услышать разные точки зрения. А порой вообще не слышим никаких точек зрения на довольно важные для страны проблемы.

— Долгое время в Беларуси очень любили российский канал НТВ, который считали свободным, острым и справедливым. Но сейчас он превратился в подобие белорусского телевидения...

— Не сейчас, а еще в 2000—2002 годах НТВ как канал, который мы считали образцом, был разгромлен. Тогда он был жестко оппозиционным Путину. Был вариант самоуничтожиться или перепрофилироваться. Еще несколько лет канал держал марку: там работал Парфенов, они комментировали Норд-Ост. Это, кстати, и стало последней каплей в чаше терпения власти. Потом канал был даже не переформатирован, а перепрофилирован так, что память о старом НТВ была растоптана. Теперь это треш, рассчитанный на брутального мужчину, который после работы любит посмотреть расчлененку и прочие "радости" жизни.

В свое время это был шок — никто в России не верил, что так можно расправиться с одним из самых влиятельных каналов. Но это стало очень "хорошим" примером для всех остальных: все сразу испугались и поняли, как надо работать.

— Вы успели побывать в белорусском Институте журналистики. Каковы впечатления от студентов — отличаются ли они чем-то от московских?

— Московские журфаковцы мне кажутся пресыщенными, нелюбопытными, неинтересующимися, слишком самодостаточными. Мне не нравится с ними общаться. А вот в других городах России студенты факультетов журналистики очень хорошие: настоящие и живые. Минские студенты мне тоже понравились. Они открытые, приветливые, любознательные, лишенные юношеского пофигизма и снобизма. Наше общение происходило с искренней заинтересованностью.

— Ваша дочка тоже училась на факультете журналистики. В одном из ваших интервью вы говорили, что восторга от этого не испытывали...

— Она перед поступлением не очень хорошо училась в школе и все никак не могла разобраться, чего же ей хочется. И в итоге, как часто бывает, пошла по пути наименьшего сопротивления. К счастью, специализацию она выбрала сама — фотожурналистику. Думаю, это дело всегда накормит.

Сейчас она только начинает работать, вышла замуж... Пока я в ней не вижу упорства и желания что-то сделать в профессии. Может, когда пройдет первый период упоения семейной жизнью, все это появится. Правда, если решит родить ребеночка, то, боюсь, уже и не появится...

— Ваш муж был тоже журналистом — одним из практиков и теоретиков телевидения, автором, по учебникам которого много лет учатся студенты. Что, по-вашему, тяжелее: работать в журналистике или жить с журналистом?

— Одинаково тяжело и то, и другое. Бывая на журфаках, я всегда говорю студентам, что их ждет нелегкая жизнь. Особенно девочек. Им все время придется делать выбор между семьей и работой. Большинство мужей, отдавая должное талантам жены, все равно хотят, чтобы в доме был борщ, свежевыглаженные рубашки и чистота. А уж если муж не занимается журналистикой, то это просто кошмар. Потому что обычные мужчины просто не понимают, как можно делать что-то в ущерб семье. А ведь если ты плотно занимаешься профессией, совместить это — нереально...

— Значит, лучший муж для журналистки - коллега?

— Во всяком случае жизнь двух журналистов, если они между собой не соревнуются, всегда интересна. Мой муж все время был моим первым читателем и критиком. Высказывал свои замечания, а первое время жестко правил и вымарывал. Мне это было очень полезно.

— Наверняка сейчас, несмотря на успешную карьеру, порой приходит жалость о несделанном для ребенка...

— С другой стороны, если ребенок с мозгами, то он оценит, что его мама стала значимой личностью. А дети, которых мама всю жизнь облизывала, отказываясь от профессии, в итоге этого не ценят и воспринимают родительницу как домработницу.

— Вы знаменты участием в серьезных проектах: обозреватель газеты "Известия", ведущая "Пресс-клуба". А недавно начали вести телепередачу "Друзья моего хозяина", куда приходят звезды со своими домашними питомцами. Решились на облегчение жанра отдушины ради?

— Продюсером передачи является моя подруга, которая, зная, что у меня есть любимая собака, вдруг решила, что именно я буду вести передачу. Я долго отбивалась от этого предложения и говорила, что она сошла с ума. Но в результате втянулась. Сейчас занимаюсь расширением кругозора зрителей канала "Домашний". Они ведь в основном любят всякие гламурные "Поющие трусы", а я приглашаю людей другого ранга: хороших актеров, телеведущих.

— Как знакомые отнеслись к смене вашего амплуа?

— Кто-то на моем месте побоялся бы удара по репутации — дескать, серьезная журналистка занялась несерьезным делом. Но у меня настолько железобетонная репутация, что ей ничего не повредит. Мои друзья отнеслись к этому с юмором. Некоторые справедливо заметили, что в ситуации, когда все меньше остается возможностей говорить что-то серьезное, это идеальная ниша.

— За что вы могли бы покритиковать себя как телеведущую?



ЛИЧНОЕ ДЕЛО

Ирина Петровская

Телевизионный обозреватель и ведущая еженедельной рубрики "Теленеделя" газеты "Известия". Ведущая телепередачи "Друзья моего хозяина" на канале "Домашний".

Родилась в 1960 г. в Москве.

В 1982 г. окончила телевизионное отделение факультета журналистики МГУ.

Работала в журналах "Журналист", "Огонек"; была членом редколлегии и обозревателем "Независимой газеты", "Общей газеты"; вела программу "Газетные истории" телекомпании "Облик", программу "Пресс-клуб" на канале РТР; работала главным редактором еженедельника "Семь дней".

В марте 1999 г. была награждена премией президента России.

— Сейчас формат моей передачи смешной, потому и критиковать смешно. Но когда я вела серьезный "Пресс-клуб", то критиковала себя за то, что не держала удар, не так развивала беседу, не могла вовремя среагировать...

— Полезно поработать тем, кого критикуешь?

— Я узнала, что прямой эфир — стрессовое дело. Постоянно выходила из студии как выжатый лимон, совершенно не понимая, почему телевизионщики называют свою работу наркотиком.

Но телевизионная практика полезна не только для моей газетной работы. В нашей да и, наверное, в вашей стране велико влияние чиновников и бюрократов. Если ты обычный человек, то они смотрят на тебя как на пустое место. А если у тебя знакомая им физиономия, они становятся подобострастными, так и норовят тебя без очереди пропустить. Понимаю, что это — использование служебного положения в личных целях. Но, к сожалению, это вещь, в нашей ситуации весьма полезная.

— В Минске вы принимали участие в "круглом столе", посвященном телевизионным фильмам. Чем он вам запомнился?

— Меня изумила одна дама, которая начала учить российское телевидение, ставя в пример белорусское. Хотя я не защитник российского телевидения, меня это задело. Понимаю, если бы здесь был эталон телемастерства. Но когда выясняется, что здесь производится 5 своих фильмов в год, а у нас — 555, это смешно. Конечно, из того, что производится у нас, 75 % — полное дерьмо. Но при этом в России есть индустрия — не капанье в час по чайной ложке, а материал, о котором можно говорить.

— На этом же "круглом столе" руководитель "Беларусьфильма" Владимир Заметалин высказал мнение, что факультеты журналистики вообще не нужны. Вы с ним согласны?

— На журфаке учат основам — чем жанры друг от друга отличаются, как технологически правильно что-то делать. Но, мне кажется, научить профессии на журфаке невозможно. Однако он нужен для общего гуманитарного образования. Один мальчик на нашем журфаке спросил у меня, зачем все это учить. Да затем, что журналист должен быть образованным человеком. Если нет осознания этого — не учитесь вообще нигде. Сейчас у нас и без диплома в газетах многие работают. Но когда проходит юный кураж, а ничего другого не наработано, нехватка образования становится видна. Когда видишь на репортажных мероприятиях какого-нибудь пожилого дядечку на артритных ногах, становится его жалко — значит, ничего большего он не смог достичь.

Нужно ведь постоянно за новые пределы выходить...

— Долго ли пришлось вас уговаривать приехать в Беларусь?

— Я приехала бесплатно, но согласилась на поездку не сразу. У меня конвейерное существование: в четверг я сдаю текст, в субботу выхожу в эфир, раз в десять дней записываю телеэфир, плюс еще какие-то мероприятия. Поэтому всякий отъезд выбивает меня из колеи. Я понимала, что никаких открытий меня здесь не ждет. Но, как говорит один мой знакомый, у меня не выработана культура отказа. Хотя о приезде не пожалела. Правда, не могу сказать, понравился ли мне Минск — видела город мельком. Вот из номера гостиницы (Ирину Петровскую поселили в отеле "Беларусь") видны разноуровневые освещенные верхушки домов на набережной — когда лежишь на кровати, такое ощущение, что ты где-то в Америке...

Ольга ПРУДНИКОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЛІСТАПАДА 2008 г.

НАПЯРЭДАДНІ

Роздум Уладзіміра Парфяновіча напярэдадні Алімпійскага сходу

Зусім хутка ў Беларусі будуць падведзены вынікі працы спартыўнай галіны за апошнія чатыры гады. Як звычайна, "разбор палётаў" адбудзецца на Алімпійскім сходзе пад старшынствам Аляксандра Лукашэнкі.

Пакуль дакладная дата правядзення гэтага мерапрыемства невядомая. Алімпійскі сход збіраліся правесці на пачатку снежня, аднак у апошні момант дату крыху "ссунулі". Па інфармацыі, якая маецца ў "Народнай волі", Алімпійскі сход усё ж такі пройдзе да канца года.

Чакаць нейкіх сенсацыйных кадравых перастановак на гэты раз не выпадае. Падстаў для гэтага няма, бо мінулая Алімпіяда ў Пекіне была для суверэннага беларускага спорту самай паспяховай — нашы атлеты заваявалі 19 узнагарод.

"Надыходзячы Алімпійскі сход мае толькі адну інтрыгу, — лічыць трохразовы алімпійскі чэмпіён Уладзімір Парфяновіч. — *Яна заключаецца ў тым, як усё ж такі вырашыцца сітуацыя з Іванам Ціханам і Вадзімам Дзевятоўскім. Хлопцы апынуліся замешанымі ў малапрыемнай допінгавай гісторыі. Вельмі пахвальна, што дзяржава вуснамі міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава выказала намер адстойваць спартсменаў нават у судзе... Але ў гэтай сітуацыі насцярожваюць адразу два моманты: тое, што сітуацыя на сённяшні дзень не вырашана і хоць маленькая, але магчымасць "канфіскацыі" медалёў у нашых атлетаў пакуль існуе... Мне б канечне, не хацелася, каб гэта здарылася. І другое: я сам спартсмен — і ніколі не паверу ў тое, што калі спартсмены ўжывалі допінг, то не ведалі пра гэта. Тут іншае. Мяне цікавіць: калі факт ужывання допінгу пацвердзіцца, то навошта нашы атлеты ішлі на гэта? Яны ж бы і так нядрэнна выступілі..."*

Уладзімір Парфяновіч лічыць, што скандальная гісторыя не паўплывае на лёс міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава. Ён нядаўна адзначыў шасцідзесяцігадовы юбілей і мог бы сысці на пенсію, але ён свайго крэсла не пакіне. *"За што яго адпраўляць на пенсію?* — разважае Парфяновіч. — *Чалавек знаходзіцца на сваім месцы, яго праца на гэтай пасадзе даволі паспяховая. І ўвогуле, у нашай краіне, хто пенсіянер, а хто не — вырашае толькі адзін чалавек. Каму пара на заслужаны адпачынак, а каму не — вырашае Аляксандр Рыгоравіч. Тым больш калі гэта тычыцца высокіх чыноўнікаў... Таму, я думаю, Лукашэнка папросіць Грыгарава папрацаваць яшчэ".*

Парфяновіч таксама ўпэўнены, што на Алімпійскім сходзе будуць агучаны планы на бліжэйшую зімовую Алімпіяду, якая адбудзецца ў 2010 годзе ў Ванкуверы. *"Да яе засталося не так шмат часу,* — гаворыць Парфяновіч. — *Напэўна ж Лукашэнка захоча ведаць, колькі медалёў заваююць на зімовых Алімпійскіх гульнях беларускія спартсмены. Шчыра кажучы, мне цяжка сказаць, якую лічбу агучаць нашы функцыянеры, але, на маю думку, наўрад ці ў скарбонцы беларускай зборнай будзе больш, чым за два медалі. Тут стаўка, як звычайна, робіцца на фрыстайл... І на сённяшні дзень — гэта ўсё. Беларускі біятлон перажывае не лепшыя часы, мне падаецца, што біятланісты на будучай Алімпіядзе медалёў не возьмуць. Падкрэсліваю — беларускія біятланісты. Ёсць, канечне, варыянт пайсці па простым шляху — аформіць грамадзянства нашай краіны на кагосьці з "чужакоў". Што гэта дасць? Можа быць, неблагі з пункту гледжання спартыўных паказчыкаў вынік. У біятлоне гэта практыкуюць. Тут варта ўзгадаць прыклады Драчова і Зубрылавай. Толькі вось ці будзе на самым версе атрымана "санкцыя" на растрату дзяржаўных сродкаў з тым, каб укладваць грошы ў "чужых" спартсменаў..."*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Мария Шарапова — самая богатая спортсменка России

Российская теннисистка Мария Шарапова стала самой богатой спортсменкой страны по итогам 2008 года. По данным журнала "Финанс", в этом году Шарапова заработала 25,5 миллиона долларов. Вторым в списке самых богатых спортсменов России оказался баскетболист клуба НБА "Юта Джаз" Андрей Кириленко (15,1 миллиона долларов).

Третье место досталось хоккеисту Александру Овечкину, который играет за клуб НХЛ "Вашингтон Кэпиталс". В 2008 году он заработал девять миллионов долларов.

Места с четвертого по десятое занимают семь хоккеистов, которые, как и Овечкин, выступают в НХЛ: Илья Ковальчук (7,5 миллиона долларов), Николай Хабибулин (6,8 миллиона), Павел Дацюк (6,7 миллиона), Сергей Гончар (6 миллионов), Андрей Марков (5,8 миллиона), Евгений Набоков (5,5 миллиона) и Сергей Зубов (5,4 миллиона).

Невзирая на авторитеты

Теннисист Джимми Коннорс, носивший три года звание первой ракетки мира, арестован полицией в Санта-Барбаре, сообщает "Ассошиэйтед Пресс".

Коннорса арестовали перед входом на спортивную арену UCSB Events Center, где начиналась игра баскетбольных команд университетов Санта-Барбары и Северной Каролины.

Причиной ареста послужил отказ теннисиста покинуть площадку при входе на спортивную арену и последующее физическое сопротивление. Подробности инцидента пока неизвестны.

Восьмикратный победитель турниров Большого шлема Джимми Коннорс носил звание первой ракетки мира с 29 июля 1974-го по 22 августа 1977 года, установив тем самым рекорд, продержавшийся до 2007 года.

СПЕЦИАЛЬНЫЙ РЕПОРТАЖ

Крути педали!

В конце прошлой недели представители немецкой компании сдали в эксплуатацию велотрек на велодроме строящейся "Минск-Арены".

Главный специалист УП "УКС Мингорисполкома" Николай Ананьев по дороге на велодром рассказывает, что *"работы еще хватает"*. Есть небольшие проблемы, которые *"решаемы"*. Но в целом *"все идет по плану"*.

Сам велотрек, конечно, впечатляет. Как и весь велодром. Светлый, просторный, но в то же время — уютный. Немцы, сдавая объект, пожелали, чтобы его апробировали ведущие спортсмены Беларуси. Как же здесь обойтись без чемпионов мира Василия Кириенко и Натальи Цилинской?!

"Вне всяких сомнений, этот трек лучше, чем в Крылатском, — констатирует восьмикратная чемпионка мира. — *Хотя бы уже потому, что его длина — 250 метров — соответствует мировым стандартам. Кстати, мой российский тренер Станислав Соловьев не прочь перебраться в Минск.*



Очень приятно, что у нас появилось такое великолепное сооружение. Мне-то пришлось почти все время тренироваться в Москве. А это совсем не то".

Вторит ей и Василий Кириенко: *"На мой взгляд, покрытие отлично подходит практически ко всем дисциплинам: трек широкий, вираж длинный, что особенно удобно для командной гонки. Велосипед при езде не "бросает". Мне наш трек чем-то напоминает манчестерский, где минувшей весной я стал чемпионом мира. Остается только пожелать, чтобы он стал для белорусских гонщиков счастливым".*

Пока немцы любуются на свою работу, чемпионы наматывают круги, а Наталья Цилинская дает мастер-класс для молодых спортсменов.

— Немецкая компания "Шурман Архитект" — одна из ведущих мировых фирм по строительству треков, — рассказывает тем временем мне Николай Ананьев. — *Она и занималась проектированием и устройством велотрека. Но рабочих набирали в Беларуси. Внутри велодрома будет универсальное покрытие, на котором можно в будущем проводить учебно-тренировочный процесс, соревнования по многим игровым видам спорта. Что касается "Минск-Арены", то, как и планировали, объект сдадим в конце следующего года. Сегодня уже поднимается последняя арка на конькобежном стадионе, идет устройство кровли на самой арене. А на велодроме чемпионат Беларуси по велоспорту пройдет уже 30 декабря.*

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Усе — на падпіску!

«Народную волю» вярнулі ў каталогі «Белпошты», і цяпер падпіску на першую палову 2009 года можна свабодна аформіць у любым паштовым аддзяленні.

Так, "Народная воля" прарвала блакаду — з 1 снежня яна будзе друкавацца ў Мінску і распаўсюджвацца праз шапікі "Белсаюздруку". Вярнулі газету і ў каталогі "Белпошты", і цяпер падпіску на першую палову 2009 года можна свабодна аформіць у любым паштовым аддзяленні.

Не трэба хваляваццa тым чытачам, хто ўжо зрабіў перадаплату за нумары першай паловы 2009 года — неабходныя звесткі пойдуць у базу даных "Белпошты", і вы будзеце рэгулярна атрымліваць газету. Дарэчы, з тым каб не згубіць сваіх пастаянных чытачоў, **рэдакцыйную** падпіску мы пакуль не спыняем. Можна дзейнічаць як праз паштовыя аддзяленні, так і праз рэдакцыю. Таму і ў сённяшнім нумары змяшчаем узор квітка і абаненцкай карткі.

Афармляйце **перадаплату** на студзень—чэрвень 2009 года ўключна альбо на любы абраны тэрмін — на месяц, два, тры, чатыры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, на фінансавы крызіс, які бярэ за горла і Беларусь, у нас тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што тым, хто вырашыць зрабіць парадаплату праз рэдакцыю, па-ранейшаму **трэба перасылаць у рэдакцыю не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель май, июнь 2009 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель май, июнь 2009 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2009 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

У богатых свои причуды

Британский боксер-тяжеловес Леннокс Льюис, не выходивший на ринг с июня 2003 года, заявил, что он готов провести бой с Виталием Кличко за 100 миллионов долларов.

При этом 43-летний Льюис подчеркнул, что в данном вопросе деньги для него не главное. "Дело в уважении и славе. Мне нечего доказывать", -- цитирует британца интернет-издание fightnews.com.

Леннокс Льюис провел свой последний бой 21 июня 2003 года, победив техническим нокаутом именно Виталия Кличко. Украинец, в 2008 году вернувшийся на ринг после почти четырехлетнего перерыва, в настоящее время владеет титулом чемпиона мира по версии WBC (Всемирный боксерский совет). Это звание он завоевал 11 октября, победив нигерийца Сэмюэла Питера.

WBC обязал Виталия Кличко провести бой с официальным претендентом -- кубинцем Хуаном Карлосом Гомесом. Однако украинский боксер считает, что зрителям был бы более интересен его поединок с Льюисом или чемпионом мира по версии WBA (Всемирная боксерская ассоциация) Николаем Валуевым.

Сам признался

Американский легкоатлет Тим Монтгомери заявил, что он употреблял запрещенные препараты перед Олимпиадой 2000 года в Сиднее, где он завоевал золотую медаль в составе эстафетной команды на дистанции 4х100 метров.

По словам Монтгомери, перед Играми в Австралии он применял тестостерон и гормон роста, сообщает "Ассошиэйтед Пресс".

Спортсмен сделал свое признание во время съемок передачи "Real Sports with Bryant Gumbel", которая выйдет в эфир 25 ноября на американском канале HBO. Монтгомери отметил, что он не заслуживает золотой медали, но подчеркнул, что говорит только себе и не ставит под сомнение достижения своих партнеров по эстафетной команде.

Представитель Олимпийского комитета США заявил, что если Монтгомери действительно считает себя виновным, то он должен добровольно вернуть золотую медаль.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 26.11.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №